БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

АДРЭС: Рэдакцыі Ново-Сэрпухуская 29. Адміністрацыі Захароўская «Юбілейны Дом».

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поўдня. Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланыя рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Надпіска: з дастаўкай да дому у Мінску на 1 месяц 3 руб.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб. на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 84. Менск. Нядзеля 7 ліпня 1918 г. Год I

АБВЕСТКА.

Вымагаемыя распараджэннем Глаўнакамандуючаго 10-ай арміі ад 14-го красавіка 1918 года, паводлуг опісі сырья і фабрычных вырабаў, заяваў, дзеля мінавання кар, успамянутых у § 8 наказанаго распараджэння, павінны быць падпісаны у Градоначальстве (Падгорня ул. д. № 14, пакой 10-ы) да 12-го ліпня 1918 году.

В. п. Нямецкаго
Градоначальніка
Капітан **Кутон—Ізраель.**

Менск 5, ліпня 1918.

---

10 АРМІЯ

ГЛАУНАКАМАНДУЮЧЫ арміей
Аддзел V с № 9586/18.

Штаб арміі 27 чэрвеня 1918 г.

ПАСТАНОВА.

Каб ні дапусьціць убыткаў, якія могуць быць адтрыманы рускімі установамі для здачы грошы на захованне па грунце пісталасьні курсу, я пастанаўляю:

Пры прыеме адткрытых дэпозытаў сума павінна вылічацца у марках. Стасоўна да гэтай цаны і павінна рабіцца выдача. Цана укладу у марках павінна азначацца як у кнігах установы так і у квіце, выданым таму хто плаціць.

Вылічэння пры прыеме і выдачы грошай павінны асноўвацца на тымчасовым афіцыяльна установленым курсе.

Гэта пастанова павінна быць вывешана на нямецкай, рускай, беларускай і польскай мовах у памешканнях устаноў для здачы грошай на захованне.

Глаунакамандуючы 10 арміей
фон ФАЛЬКЕНГАЙН.
Генэрал от інфантэрыі.

Менск 7/VII.

«Труды комасіи по проведенію аграрнай рэформы в съвязи с мѣстными условіями» Минскаго губернскаго земельнаго комитета. Вельмі цікавая кніга. Уся земля аддана усяму народу. Выбіраецца эс-эроускі камітэт. Цяпер дзяліне землю па душам. Кніга складаецца з дакладоу спэцыялістау: па асушкэ балот інжэнэра Дубаха, скатавода Тімотэнко, садавода Хабенка, доклад С. Коваліка аб норме на душу і землеустраіцеля Евстратова.

У канцэ кнігі вельмі юмарыстычны спосаб праведзэння рэформы. Валасны земельны камітэт робіць праэкт раздзела земель. Праэкт землеустройства ставіцца на галасаванне вескі, калі $^{2}/_{3}$ галасоу будзе за ім, то ен пасылаецца у павет, а потым у губэрнію для настаукі штэмцэля. Доклады спэцыялістау у гэтай кніжцэ маюць высокую вартасьць. Інжэнер Дубах дау шырокі агляд патрэбнасьці асушкі нелічаных абшароу нашых беларускіх балот—для падняцця культуры.

Напрыклад, у Палессі 25 чалавек на 1 квадр. версту.

ворн. зям. 18%
лесу 35%
балот 45%

Гэта грамадны зямельны фонд.

Каналоу выкапано 4.500 верст. А са слоу другога спэцыяліста, інж. Опнокова, у Менскай губ. асушаны $^{1}/_{2}$ міл. дзесяцін, а трэба іншэ асушыць 1 800.000 дзес., трэба выпраміць 3.700 верст рэчак і рэк.

Няшчасьлівая Беларусь нацярпела ад вайны іншэ тым, што усе каналы загачэны, там праходзіу фронт. Зрабілі штучна тонь. $^{3}/_{4}$ усіх асушыцельных работ знічтожэны.

«На аграмаднай асушыцельна сплаунай сеці Туроускіх лесоу зроблены перэмычкі, ад гэтаго затоплены грамадны масіу казеннаго лесу». Ужо тры годы, як усе затоплено. Гэта кончыцца гібелью усіх лесоу на пню. Ніякіх мер, каб направіць гэту нацыянальную бяду, ні робіцца.

На рэмонт затопленых каналоу трэба 1.154.795 рабочых дзен, каб уратаваць ад гібелі 300.000 дзес. сенажаці і лесу!

Работы спэцыялістоу намагаюць нам бліжэй падайсьці да земельнай рэформы, і адкрываюць больш шырокія рэформы. Рэформа гэта ні можэ адкладывацца, бо экапомічнае развіцце Беларусі, і фундамэнт яго—добрабыт селянінау—гэтаго трэбуець безадкладна. Але работа гэта вельмі скомплікаванная і вымагаець вялікай і грунтоунай працы усіх спэцыялістау. Да гэтаго часу нічога ні зроблена, бо зваліваць яе на галаву валасьці, гэта толькі канцэлярская адпіска. Нашаму новаму сэкрэтарыяту яе арганізаваць. Наш край маець многа паважных спэцыялістоу, і трэба з іх практыкі і навукі скарыстаць.

А. У.

Агульныя весткі.

БЭРЛІН. Нямецкая біохімія іпноў зрабіла вялікае адкрыцце, забеспечываючае экапамічную нізалежнасьць Нямеччыны ад заграніцы. Удалося дабыць вельмі добры клей з бактэрыі. Гэтак ністачы клею ні будзе.

БЭРН. Сюды прыбыло 200 румынскіх уцекачоў, у тым ліку члены лібэральнай партыі, між імі Братыяну, Таке, Іонэску, і быўшыя італьянскі і француэкі паслы у Букарэшці. Большая часьць уцекачоў мапіцца задзержацца у Люцэрні. У лістападзе 1916 году, на патрэбаванне ангельцаў, перад прыходам немцаў былі зруйнаваны студні дзеля дабывання газы у румынскай прамысьлевай акрузі. На пратэсты вылатных румынаў, палкоўнік Томсап заявіў, што Англія верне усе шкоды, што грошы тут ні маюць ніякае вагі. Тады началося ніпчэнне, падобнаго каторому па размерам і бязмысьльнасьці дагэтуль ні бывала. Аднак гэты крок сваей мэты ні дайшоў. У студні месяцы 1917 году пад нямецкім кіраўніцтвам началася адбудова руін і прачыстка засыпаных крыніц газы. Пасьля шэсьцідзённай работы была прачышчэна першая студня, якая начала даваць па 6 тонн газы у дзень. Да 31 марца было прачышчано ужо больш 30 студняў, якія давалі у дзень больш за 20 вагонаў газы. Чысло прачышчаных студняў у канцы 1917 году навялічывалося да 335, а да 30 красавіка 1918 г.—386, каторыя давалі 78% нормальнай перад вайной меры газы. Гэтак ужо цяпер Румынія можэ поўным ходам выкарыстаць сваю глаўную прамысловасьць.

ВЕНА. 4/VII, Паводлуг вестак с Константынопаля, ўчора а 7 гадзіне вечара памёр Султан.

БУКАРЭШТ. Румынскі сынод палажыў царкоўны забарон на рускаго епіскапа Бэсарабіі, Анасясія, за тое, што ён адмовіуся быць у Румынскім сынодзе.

ГААГА. Гішпанская хвароба шырыцца у Лёндані. Насярод апошняго тыдня лічба занядужаўшых павялічылася у 10 разоў. У розных вялікіх местах Англіі гэтая хвароба так-сама зьявілася. Прамысловасьць вельмі церпіць ад гэтаго. У Бурнінгаме дзеля гэтаго трэба было зачыніць ўсе тэатры і кінэматографы. У Мальборо захварэло больш 60 тысяч вучняў. У Манчэстары 70 вагонаў конкі ні ходзяць дзеля хваробы службы.

БЭРН. Італьянская вэрф Ансладо павялічыла свой капітал ад 100 мільёнаў на 500 мільёнаў лір. Гэта робіцца дзеля канечнай патрэбы стварыць пасьля вайны вялікі італьянскі гандлёвы флот, каб зрабіць італьянскі гандэль нізалежным ад заграніцы.

ХРЫСТЫАНІЯ. Злучаныя Штаты пазволілі будаваць караблі меньш 1000 тонн прыватным людзям, але пад варункам што гэтыя караблі могуць быць ужыты урадам на ваенныя мэты.

ВЕНА. Імператар прыняў у доўгай аўдыенцыі быўшаго міністра міжнародных спраў графа Чэрніна.

Весткі з Расіі.

ШТОКГОЛЬМ, 3/VII. Быўшы ваенны міністр, генэрал Сухомлінаў, жыўшы пасьля свайго асвабаджэння с пад арэшту у вельмі скрутным становішчы, падаў ураду народных камісараў просьбу аб прыняцці яго у чырвоную гвардзію. Згодна вестак пецярбурскіх газэт, просьба яго прынята, але ён, с прычыны сваей старасьці, знойдзе працу толькі ва ўнутрэннай службе.

ШТОКГОЛЬМ 3/VII. Згодна «Извѣстіямъ», Троцкі прэдставіў усім заграничным пасольствам урадпае рэшэнне, паводлуг якога заграничныя падданыя у Расіі, апэрыруючыя са зброямі, лічуцца ворагамі ураду і, калі яны ні будуць выпаўняць загады ураду або будуць інтрыгаваць у згодзе с контр-рэвалюцыянэрамі, савецкія войскі будуць адносіцца да іх, як і да другіх ворагаў. Дзеля мінавання вялікіх ніпрыемнасьцяў, Троцкі прапануе прыказаць заграничным войскам, пры стычках с контр-рэвалюцыянэрамі, трымацца пэйтральна.

ШТОКГОЛЬМ 3/VII. Абодва анты-большэвіцкія урады у Омску і Харбіне, паводлуг вестак з Масквы, злучыліся. Местопрэбываннем ураду астаецца Омск, дзе знаходзіцца шмат членаў Расійскаго Устаноўчаго Сойму. Колчак назначэны ваенным і марскім міністрам, палкоўнік Іваноў—начальнікам арміі. Склад арміі—чэхо-славацкія корпусы, казакі і некалькі афіцэрскіх атрадаў. Забастовачны рух проціў савэтаў сярод жалезнадарожнікаў у Рыбінску разыходзіцца па усей лініі Масква—Пецярбург.

ШТОКГОЛЬМ. У прызыве проціў контр-рэвалюцыйнаго руху газ. «Извѣстія» піша, што даказано нібы быўшыя уруськікі Расіі стараюцца уцягнуць

Расію зноў у вайну і дабіцца гэтым кадэцкай контр-рэвалюцыі. «Ворагі рэвалюцыі», як там значыцца, «перайшлі у наступленне». Становішчо савецкаго ураду сур'ёзнае. Яна дзеля гэтаго клічэ усіх прыхільнікаў усімі сіламі даць адпор уселякаму пакіраваннаму проціў большэвікоў руху.

ШТОКГОЛЬМ. Пры выбары у саветы рабочых і чырвонаармейцаў Пецярбургу, згодна «Праўды» выбраны: 308 камуністаў, 34 левых соцыялрэвалюцыянэраў. «Праўда» дадае да гэтаго, што цыфры даказываюць, нібы сьвядомыя рабочыя кругі Пецярбургу, ні гледзючы на сваю змучанасьць ад голаду, якую ворагі стараюцца усімі сіламі выкарыстаць, ні перэстаюць верыць ў магутнасьць саветаў і ідуць на сустрэч поўнай перамозе пролетарыяту.

БЭРН. С прычыны зьяулення Керэнскаго на палітычную арэну, французкі урад цяпер болей чым калі кольвек адмечае патрэбнасьць ўмешацельства дзержаў Згоды.

Арэшт А. І. Купрына. 1 ліпня у ночы арэштаваны большэвікамі у Гатчыне вядомы расійскі пісьменнік А. І. Купрын.

Паводлуг вестак «Рус. Слова», Купрына арэштавалі за фельетон: «Михаилъ Александровичъ», надрукаваны у № 15 газ. «Молва», прызнаны большэвіцкім урадам контр-рэвалюцыйным.

З Украіны.

— **Кіеў, 2/VII.** Камісія Кіеўскай думы, зрабіўшы агляд местоваму становішчу, згодна «Возрожденію», ўвела трохклясовую выбірацкую сыстэму па прускаму абразцу.

З Крыму.

— **Кіеў, 2/VII.** Земскае сабранне Таўрычных губэрніў пастанавіло стварыць унівэрсытэт для Таўрычнаго краю, каторы часова будзе лічыцца аддзелам Кіеўскаго унівэрсытэту. Апрача агульных навук у Таўрычным унівэрсытэці асобае мейсцо займаць магамэтанская культура. Таўрычны унівэрсытэт мае знаходзіцца у розных местах, глаўным чынам у Ялце.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Аб заметцы. «Бѣлорусскій кабинетъ министровъ», паявіушэйся у газэці «Новый Вѣстникъ» ад 6-го гм., апавешчаем, што яна ні адпаведаець праудзе.

Хлебны паек, у хуткім часе, с прычын малых мучных запасау, прапануецца зьменьшыць да 2 фун. у тыдзень на порцію. Па вольнай продажы хлеб дастаецца вельмі цяжка па 3--3р. 20 к. фунт.

У вольна-пажарным таварыстве рэшано прыняць пры помачы меськай управы самыя рэшыцельныя меры дзеля узмацавання рэсурсау, праз аблажэнне асобым налогам кожнай домауласьніцкай печы.

Усе гэта робіцца з асобай мэтай бараніць карысную для места дружыну ад аканчацельнаго краху.

Абываделі павінны адклікнуцца на гэту добрую справу.

У еурэйскай абшчыне барацьба за уплыу між двума першымі па ліку партыямі—«Бундам» і Сіаністамі— прадаужаецца, прынімаючы усе новыя формы. Спачатку барацьба велася аб пытанні тых ці іншых кандыдатау прэзыдыума, а цяпер спрэчкі перайшлі па пытанням—бежанскаму і аб афіцыяльнай мове абшчыны. «Бундысты» за прыняцце еурейскае мовы пагражаюць дэмонстратыуным уходам з усіх камісій. Прэдстаунікі сіанізму, лічучы большасьць сваіх сіл, думаюць правесьці сваіх людзей на глауныя ролі, паміж іншым прэзыдыум п. Хургіна.

Выпуск бон меськаю управаю у пасядзэнні 6 ліпня рэшано зрабіць у хуткім часе.

Адстаіванне пасады. Дзеля таго, што скарбовая палата прызнала трэццяго члена губэрскаго прысутвія лішнім, ні па штату,—члены прысутвія рэшылі салідарна адстаіваць ранейшы штат.

Служэбныя перамены. Памоцнікі начальніка службы Л.-Р. ж. д. Уланау і начальнік рэмонта Прыгароускі аставілі сваі пасты, выехаушы у Вялікаросію. Замест Прыгароускаго начальнікам рэмонта назначаецца Бэнецкі, быушы у вайну начальнікам аддзелу сабшчэній пры глаунай стауцы.

У губэрскім казначэйстві трэццяго дня зроблена другая выемка с кассы «керэнкамі» і царскімі пад чэкавую кніжку на імя казначэйства.

Усе грошавыя дакумэнты знойдзены у поуным парадку.

Жалезнадарожныя парадкі. Са згоды нямецкіх уласьцей у ведзенне Л. Р. ж. д. зноу пераходзіць эксплоатацыя. Начальнікам яе назначаецца інжэнер Россето. Са складу служачых упрауленскіх аддэлау будуць выдзеляны асобыя кадры па эксплоатацыі; ад службы цягі—25 чал., магазыннай—37 чал., руху—12 чал., рэмонту—20 чал.

Службы камерчэская і зборау прызнаюцца нямецкімі уласьцямі лішнімі. Апрача таго, грунтавая часьць службы зборау эвакуаваны у 1915 г. у Маскву, аставіушы у Менску толькі горстку служачых.

Харчовая часьць упраулення Л. Р. ж. д. патрабуе карэных рэформау, да таго ужо дайшлі нарэканні: скаргі на кепскую пастанову справы харчоу і снабжэння.

На Александроускай ж. д. арганізацыя харчоу рэформаваная у цэлым і пратэстау ні выклікае. Месячны пай (усе рэчы першай патрэбнасьці) абходзіцца кожнаму с служачых зусім танна—53 рублі.

Епіскап Георгій паедзе на усерасійскі царкоуны сабор у чародную сэсію толькі у тым выпадку, калі ні будзе кандыдата у старшыні саборнай камісіі, у каторай уладыка працавау мінуушай вясной.

Калі епіскап Георгій у Маскву ні паедзе, дык намечаны у жніуні епархіяльны зьезд духавенства пэуна адбудзецца.

Работы па падгатоуцы да яго ні спынены.

У акружным судзе адбылася парада па пытанню аб выясненні агульнаго ліку членау суда, патрэбных па усіленню штатау, у зьвязі з расформаваннем Магілеускаго акружнаго суда, каторы далучаецца да Менскаго, па загаду нямецкіх уласьцей аб расшырэнні сфэры мейсцоваго судзебнаго округа аж да граніц располажэння X арміі.

Пытанне аб складзе мейсцоваго акружнога суда выясьніцца са зваротам старшыні Шындлера, паехаушаго па гэтаму поваду у Магілеу.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоу камандавання за 5 ліпня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта.

Усходней Іпэрна былі адбіты сільныя варожыя на

На абодвум бакам Соммы за сільным ангельскім агнём шлі пяхотныя варожыя атакі. На паўночным беразі яны пацярпелі крушэнне перад нашымі лініямі. Паўд Соммы вораг прарваўся у вёску і лес Гамель. На в усходней Гамэля яго атака была адбіта нашай контр-ат Усходней Віллер—Брэтонпэ мы адкінулі ворага у яго і нае становішчо.

У вечары баявая дзеяльнасьць ажывілася амаль на фронці групы і аставалася павышанай, глаўнае на вуч учарайшых бітваў, усю ноч.

Група арміяу Гэрманскаго Кронпрынца.

Павышаная баевая дзеяльнасьць па абодвум бака кі Эн.

Лейтэнант Менкгоф меў сваю 35, лейтэнант Туй 24 перамогу у паветры.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндор**

Весткі с кра

З Вільні.

Літоуская таурыба, скончэння рэмонту у д часовым памешканні у даўнейшаго ваеннаго суд раносіцца у новае памеш на св. Юр'еўскай вул. Ужо перанесено бюро дыуму. Потым паволі б перапосіцца бюро асобн місіяў.

Таварыство лесоулас адчынілося 1 чэрвеня пад назваю «Таварыство У нікаў Лясоў у Вільні» і мэтай:

«Абарону нашых інтэ як ўласьнікаў лясных роў;

Эксплоатацыю і ра лясных гаспадарстваў;

Пасрэдніцтво пры куп і прадажы карнёваго лес зямлі, суроваго лесу, ля матэр'ялаў і г. д.;

Інформацыю аб лесе; ц гандлёвым запатрэбаван г. і.;

Аблягчэнне развітку ля прамысловасьці ў ва ўсіх родах;

Завядзенне паказных турных-таксацыі, адміністр зьвераахранення і г. д.;»

Таварыство карыста правамі юрыдычнай а Мейсцо сядзібы Таварыст Вільня. Справамі Т-ва праўленае з асобаў: Яна ленкевіча—прэзэса, Вой Александровіча і Віт Сьвянткоўскаго—членаў.

З «Dz. Wi

На рэках Вавілону.

„Атдай мне моладасьць сваю —
—У сьвеце другім я табе заплачу".
(*«Шылер, міласьцік да краю»*).

VIII*).

Пасьля таго, як была праве зачынена Беларуская рада ў Казані, аб палітычнай працы ў шырокім значэнню гэтаго слова ні надта многа было можна думаць, і ўсім лепшым сілам краю, закіненым сюды аставалося толькі культурная праца, на якую і была зьвернена уся увага. Новая эра працы вызвала і новых працаўнікоў, між каторымі на асаблівую увагу заслужывае жыхар Гродненскай губ. Пружанскаго Пав. Уладыслаў Багдановіч. Як тыпічны беларус ён ні любіў ніколі вылазіць наперад і крычаць аб сваей працы, а ўсе што рабіў, рабіў ціха, стараючыся прынясьці як можна болі карысьці роднай справе і як наименей пахвалы сабе. Ціха і спакойна працаваў гэты чалавек ні гонячыся за тым каб гаварыць аб нашых задачах ў шумных сходах і дзякуючы гэтай працы многа перш заядлых маскаляфілаў, працерлі сабе вочы і сталіся прыкладнымі сынамі роднай бацькаўшчыны. У гэтым часе як. У. Багдановіч шырыў нашы ідэі між селянамі, дачка яго Ганна Багдановіч шчыра шырыла нашу літэтатуру і нацыянальнае пачуцьце паміж тых дзеўчат, каторые вучыліся ў гімназіях.

IX.

Працуючы пад нашым культурным адраджэннем с. У. Багдановіч і блізкія да яго людзі аднак ні запаміналі і таго што Казанскія бэларусы, апрача спынення працы ў Казанскім аддзеле Менск. Бел. Рады, больш нічым ні запратэставалі проціў тых зьдзек якія рабіліся камісарамі западнага краю над нашым народам. Скора ца гэтага зьявілася падхадзяшчая, хвіля. У лютым месяцы паміж Расіяй і Нямеччынай пачаліся пірамовы аб згодзе і Маскоўская Бел. арганізацыя разаслала адозву да усіх беларусаў, просячы далучыцца да яе адозвы к дэмократыі ўсяго сьвету, ў каторай яна пратэставала проціў падзелу Беларусі. Адозва гэта спазьнілася і папала ў Казань толькі тагды калі ўжо Троцкі ні падпісаўшы умовы выехаў з Бярэсьця і такім парадкам ў нас быў падхадзячы момэнт злажыць свой пратэст проціў Менскаго «савнаркома». Сход быў склікаены у кватэры Рускаго камітэту помачы уцекачам, што дало магчымасьць папу Тэадаровічу самазванна бяз выбару на тоя, як сябру кіраўніка Рускаго камітэту, зрабіцца прэзэсам сходу. Былі ўнесяны дзьве рэзалюцыі, ў першай з каторых, ўнесянай с. Багдановічам і іншымі блізкімі да яго людзьмі, быў зложаны пратэст проціў Менскаго «совнаркома» а так сама прасілося каб беларусам па ўсей Расіі вольна было тварыць свае нацыянальныя арганізацыі, а так сама каб Беларусь была прызнана Расійскім урадам самабытнай і незалежнай дзержавай і каб ей было дадзено право пасланць на новыя перэгаворы аб згодзе сваіх прэдстаўнікаў. Гэта рэзалюцыя падабалася ўсім селянам, а ні папу Тэадаровічу каторы ні пасароміўся падрабіць галасаванне, каб правясьці рэзалюцыю зусім адваротную тэй, якой патрабавалі жыццёвыя інтарэсы нашаго краю. Пратэсты шчырых беларусаў ні маглі паўстрымаць папа Тэадаровіча ад гэтай подласьці, бо чым жа іншым можна назваць такі пастунак.

Так рынулася наша надзея, на тое, што можа нам усёткі удасца далажыць свой голас да пратэсту проціў таго зьдзеку які у нашай роднай старонцэ чынілі над нашымі братамі тыя, каторыя ішлі з штандарам «вольнасьць, роунасьць і брацтво».

В. Грыневіч.

(Далей будзе).

*) Гл. № 75 і 73.

Рэдактар **А. Прушынскі.**
Выдавецтво **«Т-во Заранка**

Друкарня Я. А. Грынблята.